**А. Г. ЦЫМБАЛ**

# ДАКУМЕНТЫ ГАЛОЎНАЙ ЧЫГУНАЧНАЙ ДЫРЭКЦЫІ «МІНСК» ЯК КРЫНІЦА ПА ГІСТОРЫІ ПАРТЫЗАНСКАГА РУХУ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (кастрычнік — пачатак лістапада 1943 г.)

Матэрыялы калекцыі дакументаў Галоўнай чыгуначнай дырэкцыі «Мінск» уяўляюць сабой унікальны па змешчанай інфармацыі і недаследаваны комплекс, які дазваляе раскрыць розныя аспекты жыцця ў акупаванай Беларусі, дапоўніць карціну дыверсійнай дзейнасці партызанскіх фарміраванняў у ходзе аперацыі «Рэйкавая вайна». Матэрыялы актуалізуюць вывучэнне гісторыі Вялікай Айчыннай вайны на аснове кампаратыўнага аналізу дакументальных і гістарыяграфічных крыніц.

The materials document collection main railway directorate «Minsk» are a unique and unexplored information contained set of documents, which can reveal different aspects of life in occupied Belarus, complete the picture of subversive activities of partisan units in Operation «Rail War». Materials essential to study the history of World War II on the basis of comparative analysis of documentary and historiographical sources.

*Ключавыя словы*: нямецкая акупацыя Беларусі, Галоўная чыгуначная дырэкцыя «Мінск», партызанскі рух.

*Keywords*: German occupation of Belarus, Main Railroad Directory «Minsk», partisan movement.

Адметнай асаблівасцю сучаснага перыяду развіцця беларускай гістарычнай навукі з’яўляецца комплексны падыход да даследчыцкай працы, максімальна поўнае выкарыстанне дакументальных і гістарыяграфічных крыніц, правядзенне навуковых пошукаў на якасна новай дакументальнай базе.

**Цымбал Аляксандр Георгіевіч** — дацэнт кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму УА «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт», кандыдат гістарычных навук.

Асновай даследавання з’яўляюцца захаваныя ў фондах (Ф. 378) Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь дакументальныя матэрыялы германскай акупацыйнай службы транспартнага забеспячэння — Галоўнай чыгуначнай дырэкцыі «Мінск». Упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі праведзены крыніцазнаўчы аналіз трафейных нямецкіх дакументаў і матэрыялаў, датычных вынікаў баявой дзейнасці беларускіх партызан у ходзе правядзення другога этапу «Рэйкавай вайны» восенню 1943 г. на ўчастках чыгункі, падкантрольных названай дырэкцыі. У даследаванні апрацаваны фактычныя даныя, увядзенне якіх у навуковы абарот дазваляе рэканструяваць гісторыю баявой дзейнасці савецкіх партызан у акупаванай Беларусі.

Аптымальным варыянтам для вывучэння інфармацыйнага патэнцыялу нямецкіх дакументаў з’яўляецца аналіз, што паказвае гісторыю ваеннай паўсядзённасці на аснове метаду кампаратыўнага аналізу. Параўнанне агульнапрынятых гістарыяграфічных фактаў з дакументальнымі матэрыяламі калекцыі прыводзіць да высновы аб важнасці працягу навуковых распрацовак шляхам ужывання традыцыйных і новых ведаў аб ваеннай паўсядзённасці ў Беларусі. Гэта асабліва важна для яе вузкіх месцаў, узнікненне і існаванне якіх доўгі час было магчымым па прычыне панавання розных ідэалагем у дачыненні да сутнасці шматлікіх падзей будзённага жыцця на акупаванай тэрыторыі. У выніку правядзенне параўнаўчага аналізу і навуковага сінтэзу айчыннага крыніцазнаўства і сучаснай гістарыяграфіі з’яўляецца падмуркам для працэсу паглыбленага вывучэння ваенных падзей і значнага пашырэння прадмета даследавання па ваеннай гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны.

У айчыннай гісторыі, як правіла, замацаваны гістарычныя факты, якія вынікаюць з архіўных дакументаў савецкага паходжання: матэрыялаў партызанскіх фарміраванняў, Цэнтральнага і Беларускага штабоў партызанскага руху. Зварот да трафейных нямецкіх дакументаў насіў абмежаваны характар. Увядзенне ў навуковы зварот новых дакументаў дае магчымасць для асвятлення розных бакоў гісторыі ваеннай паўсядзённасці ў Беларусі за часам германскай акупацыі. Выкарыстанне новых дакументаў дазваляе не толькі значна пашырыць дакументальную базу для вывучэння асобных старонак гісторыі, але і ўнесці ўдакладненні ў айчынную гістарыяграфію з мэтай больш поўнай рэканструкцыі гісторыі Беларусі перыяду 1941—1945 гг. Выявіць новыя гістарычныя факты для крытычнага даследавання праблем вайны і беларускай ваеннай паўсядзённасці магчыма на падставе больш актыўнага выкарыстання масіву новых дакументальных крыніц, у тым ліку замежнага паходжання.

Паводле даных Беларускага штаба партызанскага руху, на працягу 1943 г. партызаны Беларусі нанеслі значны ўрон нямецкім акупантам. За год баявых дзеянняў былі пушчаны пад адхон 6217 эшалонаў і 19 бронепаяздоў праціўніка. Пры гэтым выведзена са строю 4875 паравозаў, 43 156 вагонаў, платформ і цыстэран. Партызаны разграмілі 22 станцыі, 35 вадакачак і 6 воданапорных веж, разбурылі 1556 км стальнога пуці, узарвалі 457 чыгуначных мастоў. У ходзе баёў знішчылі 284 казармы, 539 дзотаў і бліндажоў, 11 585 т гаручага, 458 складоў з боезапасамі, харчаваннем, амуніцыяй і абмундзіраваннем. Забілі і паранілі некалькі дзясяткаў тысяч салдат і афіцэраў праціўніка [1, с. 244; 2, с. 192].

Такая карціна баявых дзеянняў беларускіх партызан на варожых камунікацыях склалася ў выніку правядзення дзвюх спецыяльна падрыхтаваных аперацый пад кодавымі назвамі «Граніт» і «Рэйкавая вайна».

Толькі за другі этап «Рэйкавай вайны», які атрымаў кодавую назву «Канцэрт», беларускія партызаны падарвалі каля 90 тыс. рэек, пусцілі пад адхон 1041 варожы эшалон, знішчылі 72 чыгуначных масты, разграмілі 58 гарнізонаў праціўніка, забілі і паранілі больш за 53 тыс. гітлераўцаў. Аперацыя «Канцэрт» выклікала сур'ёзныя ўскладненні ў перавозках нямецка-фашысцкіх войскаў, прапускная здольнасць чыгункі знізілася на 35—40 % [3, с. 95].

Ідэнтычныя характарыстыкі вынікаў аперацыі «Канцэрт» згадваюцца ў познасавецкіх выданнях. Адзінае, што іх розніць, з'яўляецца адсутнасць даных аб агульнай колькасці забітых і параненых гітлераўцаў [4, с. 367]. У сучаснай беларускай гістарыяграфіі прыводзяцца крыху іншыя звесткі, з якіх вынікае, што за час аперацыі на ўсёй савецкай акупаванай тэрыторыі было падарвана каля 150 тыс. рэек, у тым ліку больш 90 тыс. рэек на тэрыторыі Беларусі. Беларускія партызаны пусцілі пад адхон 1041 варожы цягнік, вывелі са строю 807 паравозаў, 6360 вагонаў-платформаў і цыстэран, узарвалі 72 чыгуначныя масты, знішчылі больш за 400 км тэлефонна-тэлеграфных ліній і інш. [5, с. 95].

Між тым па цяперашні час застаюцца без адказаў некаторыя важныя пытанні, датычныя баявых дзеянняў беларускіх партызан на чыгунцы ў сферы дзейнасці галоўнай чыгуначнай дырэкцыі «Мінск». Так, напрыклад: наколькі эфектыўнай з'яўлялася баявая дзейнасць у кантэксце параўнання звестак аб агульнай колькасці дыверсій на ўсёй часова акупаванай савецкай тэрыторыі, дзе дзейнічалі дырэкцыі «Рыга», «Кіеў» і «Днепр», у тым ліку ў Беларусі ў сферы дзейнасці дырэкцыі «Мінск»; у якой ступені можна лічыць рэальнымі прыведзеныя лічбы аб нямецкіх стратах, у тым ліку разам з мясцовымі служачымі чыгункі, калі агульная

колькасць месячных страт забітых салдат вермахта, нямецкіх і мясцовых чыгуначнікаў агулам не перавышала 135 чалавек, а сярэдняя колькасць нямецкіх і мясцовых параненых і зніклых у месяц складала 406 чалавек; якое выпрабаванне ўяўляла насамрэч для германскай ваеннай чыгуначнай службы знішчэнне згаданых у савецкай статыстыцы каля 150 тыс. рэек, калі 4 германскімі дырэкцыямі і 3 палявымі чыгуначнымі камандамі, якія дзейнічалі на аператыўнай тэрыторыі армейскіх груп, былі зафіксаваны толькі 15 163 дыверсіі, праведзеныя савецкімі партызанамі на працягу 1943 г. на ўсёй часова акупаванай тэрыторыі. Гэтыя і іншыя важныя пытанні да цяперашняга часу пакуль застаюцца без пераканаўчых адказаў. Зрабіць гэта магчыма на аснове дакументальных звестак, пакінутых у дакументах Галоўнай чыгуначнай дырэкцыі «Мінск».

Калекцыя дакументаў Галоўнай чыгуначнай дырэкцыі «Мінск» уяўляе сабой вялікі па аб’ёме, унікальны па змешчанай інфармацыі і недаследаваны комплекс дакументаў, які дазваляе больш шырока раскрыць розныя аспекты жыцця на акупаванай тэрыторыі Беларусі і, у прыватнасці, дапоўніць карціну дыверсійнай дзейнасці партызанскіх фарміраванняў падчас правядзення «Рэйкавай вайны». У дакументах калекцыі змяшчаюцца паведамленні, якія храналагічна адносяцца да кастрычніка — снежня 1943 г. і ахопліваюць практычна ўсю тэрыторыю Беларусі.

Пры вывучэнні дакументаў былі выяўлены і прааналізаваны дакументальныя факты, змешчаныя ў штодзённых данясеннях нямецкіх чыгуначных службаў аб дыверсіях і ўздзеяннях ворага на падначаленых ім камунікацыях акупаванай Беларусі.

Данясенні [6—11] уяўляюць сабой паведамленні аб дыверсіях на чыгунцы, у якіх утрымліваюцца звесткі: дата здарэння; працягласць затрымкі руху (у кірунку фронту і тылу); характар нанесеных пашкоджанняў лініям камунікацый і рухомаму саставу; лакалізацыя месца здарэння (указваюцца лінія руху і адрэзак пуці, дзе адбыўся выпадак); прыводзяцца страты, панесеныя абодвума бакамі; вызначаецца характар дыверсіі (напад ці падрыў, указваецца від міны). Аднак у некаторых выпадках паведамленні адступаюць ад дадзенай схемы і ў іх утрымліваецца не зусім поўная інфармацыя.

З агульнага масіву, які налічвае больш за 500 аднатыпных данясенняў нямецкіх чыгуначнікаў, у даследаванні зроблена рэпрэзентатыўная выбарка. Для аналізу дыверсійнай дзейнасці партызан былі абраны паведамленні за кастрычнік — пачатак лістапада 1943 г. Вылучэнне ўказанага перыяду абгрунтавана наступнымі падставамі. З крыніцазнаўчага боку гэта: 1) паведамленні за кастрычнык — пачатак лістапада з’яўля-

юцца найбольш поўнымі; 2) на працягу гэтага часу практычна адсутнічаюць разрывы па храналогіі паведамленняў; 3) да кастрычніка — пачатку лістапада адносіцца пераважная большасць з агульнай колькасці паведамленняў (386 адз.). З гістарычнага боку — менавіта на гэты перыяд прыпадае ажыццяўленне другога этапу «Рэйкавай вайны», які атрымаў кодавую назву «Канцэрт» і які ажыццяўляўся з 19 верасня да канца кастрычніка — пачатку лістапада 1943 г.

Для вывучэння і сістэматызацыі інфармацыі крыніц была складзена табліца, у якую ўключана 386 паведамленняў за перыяд з 06.10.1943 па 01.11.1943. Апрацоўка праводзілася па наступных крытэрыях: дата здарэння, час затрымкі руху (на фронт, у тыл), характар пашкоджання, месца здарэння (лінія руху, адрэзак пуці), страты (грамадзянскія, ваенныя, партызанскія) і таксама від нападу ці дыверсіі (від міны, колькасць падрываў ці абстрэл). Праведзены аналіз дазваляе выявіць некаторыя тэндэнцыі і адзначыць храналогію дыверсійнай дзейнасці партызан, паказаць інтэнсіўнасць нападаў на чыгуначныя камунікацыі, ахарактарызаваць час затрымкі руху нямецкіх эшалонаў у абодвух кірунках, вызначыць геаграфію дыверсій, страты бакоў і вылічыць прыблізную агульную колькасць дыверсійных акцый.

1. З даных, атрыманых у ходзе працы з новымі дакументальнымі матэрыяламі, вынікае наступная карціна баявых і дыверсійных дзеянняў беларускіх партызан на чыгуначных камунікацыях акупаванай Беларусі ў кастрычніку — пачатку лістапада 1943 г. (гл. дыяграму).

**Колькасць дыверсій на чыгунках Беларусі ў кастрычніку 1943 г.**



Найбольшая колькасць дыверсій прыходзіцца на 9—10 і 25—26 кастрычніка (па 39 паведамленняў), 16—17 кастрычніка (36) і 8—9 кастрычніка (35). Найменшая — на 6—7, 20—21 і 28—29 кастрычніка (7). Выразна назіраецца таксама спад дыверсійнай актыўнасці з сярэдзіны месяца і апошні ўсплеск актыўнасці напрыканцы, 25—26 кастрычніка.

2. Час затрымкі руху. У паведамленнях зафіксаваны наступныя даныя (гл. табліцу).

**Час затрымкі руху на чыгунках Беларусі ў 1943 г.**

| Час затрымкі | Больш за 3 гадзіны | Больш за 6 гадзін | Больш за 12 гадзін | Больш за 24 гадзіны |
|---|---|---|---|---|
| Колькасць выпадкаў у кірунку фронту | 153 | 104 | 42 | 6 |
| Колькасць выпадкаў у кірунку тылу | 169 | 107 | 47 | 3 |

Працягласць затрымкі руху ў кірунку фронту невядома больш чым у 93 выпадках, у кірунку тылу — больш чым у 94 выпадках.

У цэлым час затрымкі руху ў абодвух кірунках супастаўны. Невялікая перавага ў затрымцы руху ў кірунку тылу адзначаецца па часе больш за 3 гадзіны (на 16 выпадкаў больш). Вызначыць агульны час затрымкі па кожным з кірункаў, як і агульны ў абодва бакі, не ўяўляецца магчымым па прычыне адсутнасці поўнай інфармацыі па кожным здарэнні.

3. Характар пашкоджанняў. Згодна паведамленням у выніку дыверсій былі нанесены пашкоджанні рознай ступені або сышлі з рэек 93 лакаматывы і больш 120 вагонаў. Пашкоджана больш за 535 рэек, знішчана больш за 5770 метраў верхняй будовы пуці і рэек. Падарвана 16 мастоў, пашкоджаны 1 воданапорная вежа і 100 метраў тэлефонных ліній.

4. Месца дыверсій. У паведамленнях адзначаны дыверсіі на наступных лініях руху: Жабінка — Лунінец — 45 паведамленняў аб дыверсіях; Мінск — Асіповічы — 38; Круляўшчызна — Полацк — 30; Лунінец — Калінкавічы — 28; Ваўкавыск — Баранавічы — 15; Мінск — Барысаў —13; Ліда — Маладзечна — 13; Маладзечна — Круляўшчызна — 13; Калінкавічы — Гомель — 12; Брэст — Ковель — 11; Брэст — Бяроза — 11; Віцебск — Орша — 10; Барысаў — Орша — 9; Маладзечна — Мінск — 9; Брэст — Бяроза-Картузская — 9; Калінкавічы — Оўруч — 8; Масты — Ліда — 8; Маладзечна — Полацк — 7; Баранавічы — Лунінец — 6; Магілёў — Жлобін — 5; Асіповічы — Жлобін — 5; Брэст — Влодава — 4.

Найбольшая колькасць дыверсій, паводле паведамленняў, адбылася на лініі Жабінка — Лунінец (45), затым — Мінск — Асіповічы (38), Лунінец — Калінкавічы (28), Круляўшчызна — Полацк (25). На астатніх лініях дыверсіі здзяйсняліся менш за 4 разы.

5. Адрэзак пуці. Дыверсіі былі ажыццёўлены на наступных адрэзках пуці: ст. Гарадзец і ст. Вулька — 9 паведамленняў аб дыверсіях; ст. Круляўшчызна і ст. Падсвілле — 8; ст. Міханавічы і ст. Седча — 7; ст. Каржэўка і ст. Пціч — 7; ст. Вулька і ст. Драгічын — 6; ст. Ельск і ст. Славечна — 6; ст. Седча і ст. Рудзенск — 6; ст. Княгінін і ст. Будслаў — 6; ст. Падсвілле і ст. Зябкі — 6; ст. Гаўя і ст. Юрацішкі — 5; ст. Багушэўская і ст. Стайкі — 5; ст. Юрацішкі і ст. Багданаў — 4; ст. Гарадзішча і ст. Смалявічы — 4; ст. Талька і ст. Вярэйцы — 4; ст. Каржэўка і ст. Муляроўка — 4.

Найбольшая колькасць дыверсій здзейснена на адрэзку пуці паміж станцыямі Гарадзец і Вулька (9) лініі Жабінка — Лунінец. Наступныя: адрэзкі пуці паміж ст. Круляўшчызна і ст. Падсвілле (8), лінія Круляўшчызна — Полацк, ст. Міханавічы і ст. Седча (лінія Мінск — Асіповічы), ст. Каржэўка і ст. Пціч (лінія Лунінец — Калінкавічы) — па 7 дыверсій. На астатніх адрэзках пуці дыверсіі здзяйсняліся менш за 4 разы.

6. Страты, панесеныя ў выніку дыверсій. *Грамадзянскія*: забітых — 3, сярод якіх 1 нямецкі чыгуначнік. Паранена — больш за 33, сярод якіх у асноўным чыгуначнікі (машыністы, качагары), мясцовыя рабочыя і адзін член Арганізацыі Тодта; *Вайсковыя*: забітых — 11, сярод якіх 1 венгерскі салдат і 1 салдат чыгуначнай аховы. Паранена — 78; *Партызанскія*: забітых — 1 (выбухам пры закладанні міны).

7. Від нападу (від выкарыстанай міны). Паведамленні нямецкіх чыгуначных службаў сведчаць, што ў 128 выпадках выкарыстоўвалася міна націскнога дзеяння. У 33 паведамленнях згадваецца выкарыстанне міны нацяжнога дзеяння, у 14 — міны невядомага віду, у 10 выпадках быў зафіксаваны абстрэл партызанамі цягнікоў, у 5 — пападанне бомбы. Акрамя гэтага, у паведамленнях зафіксавана больш за 1235 падрываў пуцей.

Неабходна адзначыць, што даных аб баявых і дыверсійных дзеяннях, адлюстраваных у нямецкіх дакументах, блізка карэлюючых з дакументальнымі данымі БШПР, выявіць пакуль не ўдалося. Да гэтага часу ніхто з прадстаўнікоў савецкай гістарыяграфіі, ні ў сучаснай беларускай гістарычнай навуцы не праводзіў спецыяльнага параўнаўча-гістарычнага даследавання, выкарыстоўваючы для аналізу дакументальныя звесткі абодвух бакоў. Навуковая каштоўнасць вынікаў даследавання вызначаецца спробай правядзення кампаратыўнага аналізу, у аснову

якога пакладзены інтэграваны падыход да аналізу даных айчынных гістарыяграфічных крыніц па гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны і новых дакументальных фактаў, выяўленых у трафейных нямецкіх дакументах. Выкарыстанне матэрыялаў дакументаў галоўнай чыгуначнай дырэкцыі «Мінск» узбагачае беларускую гістарычную навуку новымі дакументальнымі крыніцамі і дакументальнымі фактамі па гісторыі Беларусі 1941—1944 гг. і па-новаму актуалізуе праблемы вывучэння гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, патрабуючы больш глыбокага яе вывучэння на падставе кампаратыўнага аналізу ўсіх наяўных дакументальных і гістарыяграфічных крыніц. Зыходзячы з ужо дасягнутага акрэсліваецца далейшая перспектыва для навуковага аналізу вынікаў традыцыйнай савецкай і сучаснай беларускай гістарыяграфіі.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны : в 3 т. / гл. редкол. : А. Т. Кузьмин [и др.]. Минск, 1984. Т. 2. 551 с.

2. *Новікаў С. Я.*, *Цымбал А. Г.* Дыверсійная дзейнасць партызан Беларусі ў 1943 г. (па матэрыялах калекцыі дакументаў Галоўнай чыгуначнай дырэкцыі «Мінск») // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 7 крас. 2011 г. Вып. 10 : у 2 т. / рэдкал. : А. А. Каваленя (адк. рэд.), С. Я. Новікаў (нам. адк. рэд.) [і інш.]. Мінск : МДЛУ, 2012. Т. 1. С. 192—196.

3. «Концерт» // Большая советская энциклопедия : в 30 т. М. : Сов. энцикл., 1973. Т. 13. С. 95.

4. «Концерт» // Великая Отечественная война 1941—1945 : энцикл. / гл. ред. М. М. Козлов. М. : Сов. энцикл., 1985. С. 367.

5. *Лемяшонак У.* «Канцэрт» // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Мінск : «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», 1997. Т. 4. С. 95.

6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 378. Воп. 1. Спр. 445. Данясенні Галоўнай дыспетчарскай управы службы руху цягнікоў аб выніках уздзеяння праціўніка ў кастрычніку 1943 г.

7. Тамсама. Спр. 788.

8. Тамсама. Спр. 789.

9. Тамсама. Спр. 791.

10. Тамсама. Спр. 792.

11. Тамсама. Спр. 793.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 21 чэрвеня 2012 г.